Бярозка

№ 9/2012(1012)









bjarozka@mail.ru
vk.com/club 34570145



Пад нарачанскімі соснамі...

Да 100-годдзя з Дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма ТАНКА

* * *

Мядзел чакаў Паэта...
Прыцішана зала гула.
Ведалі: ён са шляху
Звярнуў да свайго сяла.
Пількаўшчыны сцяжынкі
Паклікалі, як калісь,
Каб завітаў на хвілінку
Знаёмым дваром прайсці,
Зірнуць на магілы продкаў,
Адчуць роднай хаты пах,
Суседзяў былых пабачыць,
А потым прадоўжыць шлях.
Даўно ўжо сустрэча гэта
Ў гісторыю адышла.
А Мядзел чакаў паэта...
Апошняй сустрэча была...

Яніна СКРОЦКАЯ



Нарачанскія сосны

У Пількаўшчыне

Пількаўшчына!
Сцежкаю знаёмай
Да хаціны Танкавай ідзём.
Тут душа так шчыра нарадзіла
Вершы, падказаныя жыццём.
Пра бацькоў, пра родных,
Пра суседзяў.
Гумар ціхі,
Шчодрыя пачуцці.
Так хацеў Паэт,
Каб яго вершы
Ўсе людзі на зямлі пачулі.
Пількаўшчына.
Мілая мясціна.
Ты заўсёды выглядаеш годна.
Крочым мы да Танкавай хаціны —
Сонца пасміхаецца лагодна.

Наталля ДУНЕЦ, 10 клас,
ДУА «Камароўская СШ»

Максіму Танку

З тых далёкіх часоў —
З Нарачанскага краю,
Яго вершы напеўна
Для народа гучалі.

Ды нялёгкую выбраў
Хлапчына дарогу:

Праслаўляў ён свой край,
Песціў родную мову.

І былі тыя вершы,
Як належыць, ад сэрца.
Аб ім памяць людская
У вяках застанецца.

Марыя ЛЁТКА, 5 клас,
ДУА «Крывіцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа».

Дзень добры!

Дарога-стужка векавога бору
Вядзе нас да радзімы песняра.
Здаецца, соснам
мала зноў прасторы,
І рвуцца ўвысь, як песня гусляра.
Калісьці быў тут,
каля стромкіх сосен —
Натхнялі на цудоўныя радкі.
За летам прабягала следам восень,
Зіма кідала белыя шматкі.
Паэт спяваў адвечны
гімн прыродзе:
Азёры чулі, рэкі і палі.
Каб жыў вякамі
наш народ у згодзе,
І ў шчасці поўным
на святой зямлі.
Дзень добры, край Максіма Танка!
Душой з табой, калыска песняра.
Хачу, каб ад світанку да світанку
Яго паэзія нас па жыцці вяла.

Галіна ШВАЙКОЎСКАЯ

Пясняр

На Мядзельшчыне ён з’явіўся,
З Радзімай лёс свой паяднаў.
Для новых вершаў нарадзіўся
І светлы шлях сабе абраў.



Дача Максіма Танка на Нарачы.

Ён славіў сонейка і маці,
І хваль блакіт, і неба ўзлёт.
І хлеб у печы ў роднай хаце,
І казкі, што любіў народ.

Аляксандра НАЗАРАНКА, 5 клас
ДУА «СШ № 2 г. Мядзел»

Максіму Танку

Не зарасце твая дарога,
Не зацярушацца сляды,
Бо творчасць, што ідзе ад Бога,
Тут будзе помніцца заўжды.

Твой светлы твар і мужны голас,
І дабрыня, і прыгажосць —
І мудрасць — жыта спелы колас,
Усё ў адной асобе ёсць.

Такіх, як ён, на свеце мала,
І ён адзін такі для нас!
Жыццё ламала — не зламала,
Быў верны словам увесь час.

Тваімі сцежкамі іду я!
Тваёю праўдай даражу!
Яе збярогшы ў сэрцы, думках,
Свайму народу раскажу.

Паліна ЗВЯРУГА, 11 клас,
ДУА «Сваткаўская СШ імя Максіма Танка»



Я люблю сябе!

Для існавання ўсё раўназначна.
Няма нічога вялікага
і няма нічога малога.
ОША

Комплекс непаўнавартаснасці — гэта ілюзія

У нашым свеце важная кожная асоба, кожны розум і кожнае слова. Чалавек — не пясчынка на велізарным круглым шары, які завецца планета Зямля. У наш час вылучыцца з натоўпу можа любы чалавек, ён можа змяніць усё, але спачатку яму трэба знайсці сябе. Напэўна, многія чыталі Міхаіла Лермантава «Герой нашага часу». Памятаеце Пячорына? Дык вось, ён быў неверагодна разумным і незвычайным чалавекам, які не мог знайсці правільны шлях сваім сілам і магчымасцям. Усе свае ўменні ён марнаваў на пошукі кахання, хоць быў няздольны кахаць. Як і сябраваць. Але гэтыя пачуцці — самае галоўнае, што павінна быць у чалавека. Хто ж не баіцца ворага нашага сэрца — адзіноты?

Любы з нас можа стаць Чалавекам з вялікай літары. Можа прынесці карысць грамадству, але для гэтага важна кахаць і быць каханым. Гэта вельмі проста, бо каханне атачае нас паўсюль. Аднак ёсць адно «але». Самае распаўсюджанае пачуццё падлеткаў — комплекс непаўнавартаснасці, адчуванне ўласнай недасканаласці. Пачуццё, што ты ні на што не здольны і што людзі вакол нашмат лепшыя і разумнейшыя за цябе. І за гэтым вельмі часта хаваецца нават думка пра самагубства! Галоўнае — не паддавацца ёй. Бо мы створаны не проста для таго, каб дарма пражываць свае дні, а для таго, каб здзяйсняць адкрыцці і ствараць лепшае для гэтага свету.

Многія з нас задаюцца пытаннем: «А што я адзін магу зрабіць?» Тады ўзгадайце вялікіх пісьменнікаў, якія змянілі наша жыццё і мысленне, музыкаў, чые песні даходзяць да самага сэрца і натхняюць на самыя неверагодныя ўчынкі. Узгадайце навукоўцаў, якія даюць нам уяўленне пра свет і палягчаюць жыццё з дапамогай камп'ютарных тэхналогій. Пералічваць можна да бясконцасці, калі ўсяго адзін чалавек зрабіў так шмат!

Нямецкі псіхолаг Эрых Фром пісаў: «Усведамленне сваёй адзіноты, сваёй бездапаможнасці перад сіламі прыроды і грамадства робіць існаванне чалавека адасобленым і расколатым, ператварае яго ў невыносную турму. Перажыванне

ўласнай адасобленасці выклікае трывогу; больш таго, гэта крыніца ўсякай трывогі. Быць адасобленым азначае быць адрэзаным, без якой-небудзь магчымасці выкарыстоўваць свае чалавечыя сілы. Такім чынам, гэта значыць быць бездапаможным, няздольным актыўна ўплываць на свет — рэчы і людзей. Гэта азначае, што свет можа ўрывацца ў мяне, а я не ў стане рэагаваць».

Галоўнае — не быць замкнёным і не лічыць сябе горшым за іншых! Ты такі ж, як і ўсе, і здольны прынесці многае ў гэты свет. Мы разам (і кожны паасобку) можам яго змяніць! Змагайся за сябе, адстойвай свой пункт гледжання і памятай, што ты — вольны чалавек.

Алена ГАЙДУК, 15 гадоў, Жодзіна

Некалькі практычных парадаў

Дык што ж з ім рабіць — з гэтым комплексам непаўнавартаснасці? Папершае, усвядоміць, што ён, надакучлівы, у той ці іншай ступені ўласцівы багата каму! І не трэба асуджаць сябе за яго. Карацей, комплекс непаўнавартаснасці — такая ж натуральная з’ява, як і нудотнае надвор’е позняй восенню.

Важна не рабіць з яго **праблему**, не падкормліваць увагай, не песціць. Прыйшла негатыўная думка пра ўласную асобу — вучыся не перажоўваць яе, а адпускаць.

Спрабуй жыць творча! Напрыклад, не бойся смела і цікава апранацца. Але ж... стоп! Смела і цікава апранацца па поклічу сэрца, а не для таго, каб на цябе звярталі ўвагу.

Можна знайсці новыя хобі — гэта і энергію ў мірнае рэчышча накіруе, і зробіць больш шматграннай тваю асобу.

Знайдзі новых сяброў! Не бойся патэлефанаваць якой-небудзь проста знаёмай і запрасіць яе на шпацыр. Для ўсіх людзей немагчыма быць цікавым, але ж хтосьці абавязкова захопіцца тваім духоўным светам. І замест сумневаў і дрэннага настрою атрымаеш прыемнае баўленне часу.

Часта бывае проста лянотна альбо страшна займець нейкае новае захапленне. Але ж праяві сябе творча — і новых сяброў атрымаеш, і радасць адчуеш ад таго, што твой духоўны свет з бутона ператварыўся ў кветку. І паказаць сваю непаўторнасць людзям, увасобленую ў творчасць, — гэта натуральная чалавечая патрэба.

Таксама можна вучыцца жорстка не ацэньваць плён сваёй творчай працы, а проста радавацца працэсу. Ды і па-любому — сваю ўнікальнасць ты ўжо рэалізаваў! Якога б узроўню і не было тваё стварэнне.

Шматлікія людзі не без комплексу непаўнавартаснасці ў крыві. Але ж адзін чалавек будзе захапляцца сваімі пакутамі, а іншы — праігнаруе як ілюзію. І будзе рэалізоўвацца, як душа просіць, насуперак усім страхам!

Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ

Хатні гадаванец — «утылізатар негатыву»



«Мне б хоць якога-небудзь сабачку!» — уздыхаеце вы, з зайздрасцю гледзячы на суседскую балонку. Калі вы ў выніку доўгіх роздумаў, узважвання ўсіх «за» і «супраць», усё ж такі вырашылі папрасіць бацькоў пра «хоць якога-небудзь сабачку», вам трэба быць гатовым не толькі да матэрыяльных затрат, але і да нечаканага павароту падзей. Напрыклад, да алергіі або да псіхалагічнага стрэсу. «Бярозка» разбіралася, якія моманты трэба ўлічваць і пра што не забываць, калі вы вырашылі завесці жывёліну.

Слова псіхолагу

— Каб жывёла ў хаце выклікала пазітыўныя эмоцыі, а не суцэльны стрэс, рашэнне завесці яе павінна быць прынята ўсімі членамі сям'і, — кажа Людміла Сіняўская, псіхолаг Мінскага гарадскога дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансера. — Наяўнасць у сям'і хатняга гадаванца станоўча ўплывае на развіццё дзяцей, калі бацькі правільна выбудоўваюць адносіны «жывёла — дзіця». У дзяцей з'яўляецца магчымасць спазнаваць жывы свет, а галоўнае — у іх з'яўляецца сябар, аб якім неабходна клапаціцца. Хатні гадаванец з'яўляецца своеасаблівым «утылізатарам негатыву».

— Ці ёсць нейкія рэкамендацыі па ўзросце дзіцяці, пры якім варта заводзіць гадаванца?

— Гэта залежыць ад мэтаў, якія ставяць перад сабой бацькі пры набыцці звярка. Калі яны жадаюць навучыць дзяцей адказнасці, догляду і любові да жывой істоты, то гэта ўзрост ад 4 гадоў. А калі мэта пазнаёміць дзіцяці з навакольным светам і яго спазнаннем, да 3 гадоў.

— Любая жывёла хварэе і памірае. Ці варта наогул заводзіць яе? Бо гэта стрэс і перажыванні не толькі для дзяцей, але і для дарослых.

— Смерць з'яўляецца неад'емнай часткай нашага жыцця. І баяцца яе не варта. Праз пакуты развіваецца асоба і душа. І жыццё так пабудавана: калі

адны кветкі звянуць, распусцяцца новыя. I я думаю, што гараваць — гэта прымальна, натуральна, правільна. Гэта вучыць і дзіця, і дарослага спачуванню. Вучыць быць гатовым да больш сур'ёзнай страты. Таму не варта баяцца заводзіць жывёл з-за гэтага.

— Ці праўда тое, што жывёлы могуць вылечваць? Напрыклад, нервовасць, дэпрэсіўнасць.

— Бываюць выпадкі, калі дзіця, якое мае асаблівасці псіхафізіялагічнага развіцця (схільнасць да стрэсу, дэпрэсіўны стан), пры зносінах з якой-небудзь жывёлай становіцца больш спакойным, ураўнаважаным, таварыскім. Развіццё дзіцяці паскараецца. Несумненна, калі ў хаце з вамі жыве гадаванец, энергетыка змяняецца ў лепшы бок. Адна жанчына распавядала мне пра тое, як яна завяла котку ў доме і вырашыла такім чынам праблему адзіноты. Неўзабаве яна стала больш адкрытай, элегантнай, і ў яе з'явіўся малады чалавек. Зносіны і назіранне за коткай тут відавочна адыгралі сваю ролю.

— Скажыце, як правільна выбудаваць адносіны «жывёла-дзіця»?

— Каб жывёла прыносіла карысць дзіцяці, а не шкоду, неабходна пазнаёміцца з гадаванцам: растлумачыць дзецям, як можна сябе з ім паводзіць, а як нельга. Бацькі павінны на прыкладзе паказаць, як трэба даглядаць за жывёлай. А дзеці павінны слухаць бацькоў.

Трэба паказаць, што жывёла можа быць выдатным сябрам. Скажам, на прыкладзе сумеснай гульні. Неабходна растлумачыць дзіцяці, што жывёла мае патрэбу ў доглядзе. I кожны член сям'і нясе за яго адказнасць. Жывёла — не проста цацка, а жывая істота, якая таксама мае патрэбу ў спагадзе. I калі зрабіць ёй балюча, яна можа і ўкусіць. Трэба гэта зразумець.

Слова алерголагу

Яўгенія Прысевак — алерголаг Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця».

— Ці ёсць такія жывёлы, на якіх не бывае алергіі?

— Не. Але, да прыкладу, з пункту гледжання рызыкі, поўсць коткі больш небяспечная, чым поўсць сабакі. Але алергія бывае не толькі на поўсць, але і на сліну, кашуту, вылучэнні. Таму перад тым, як заводзіць любую жывёлу, трэба пракансультавацца з лекарам, зрабіць тэсты на алергію. Праўда, няма ніякіх гарантый, што алергія не выявіцца пры з'яўленні жывёлы ў хаце, нават калі тэсты нічога не паказалі. Рызыка ёсць заўсёды, і да гэтага трэба быць гатовым.



— А ці магчыма ўзнікненне алергіі на рыбак? Ці, скажам, рэптылій?

— На рыбак саміх па сабе — не. А вось на корм для іх — так. Пры яго ўдыханні

часта можа развіцца вострая алергія. Вельмі рэдка бывае алергія на эпітэлій рэптылій. Гэта адзінкавыя выпадкі.

— Якія сімптомы часцей за ўсё ўзнікаюць пры алергіі?

— Кан'юктывіт, прыступы бранхіяльнай астмы. Больш рэдка дэрматыт.

— Ці існуюць прэпараты, якія знішчалі б алергію цалкам?

— Цалкам — не. А вось якія памяншаюць клінічныя праявы ці сімптомы — так. Адзіны метад, які дзейнічае на саму прычыну, — гэта спецыфічная імунная тэрапія або, як яе называюць у апошні час, спецыфічная алергавакцынацыя.

— З якога ўзросту можна правесці алергавакцынацыю?

— З пяці гадоў.

Кошт пытання

Набыццё і трыманне хатняга гадаванца выліваецца ў немаленькія сумы.

Крама «Прырода» ў Мінску:

Акварыумныя рыбкі	— ад 4,2 да 35 тыс. руб.
Хамячкі	— 14—15 тыс. руб.
Дэкаратыўныя трусы	— 64 тыс. руб.
Акварыумы ў залежнасці ад памераў і камплектацыі	— ад 140 тыс. руб. да 1 млн. 250 тыс. руб.
Клеткі для птушак	— ад 88 да 248 тыс. руб.
Клеткі для грызуноў	— ад 70 тысяч. руб.

Птушыны рынак у Ждановічах г. Мінска:

Пародзістыя кацяняты	— 100—200 даляраў.
Пародзістыя шчанюкі	— 100—500 даляраў.
Пацукі і хамячкі	— 10—15 тыс. руб.
Дэкаратыўныя трусы	— 50 тыс. руб.
Акварыумныя рыбкі	— 4 да 25 тыс. руб.
Самкі папугайчыкаў	— 150 тыс. руб.
Самцы папугайчыкаў	— за 100 тыс. руб.
Шыншыла	— 400—450 тыс. руб.
Клеткі для грызуноў	— 80—200 тыс. руб.
Сярэдні акварыум на 150 літраў з афармленнем і абсталяваннем	— каля 400 долараў.

Акрамя гэтых трат, далей будуць штодзённыя — на корм і вітаміны. І перыядычныя — на шчоткі, шампуні, цацкі, кармушкі, ветэрынарнага лекара. Таму вам варта падумаць, якую адказнасць на сябе бераце вы і вашыя бацькі. Памятайце, «мы ў адказе за тых, каго прыручылі».

Паліна БУЧЭЛЬ, 17 гадоў, Мінск,
фота Рагнеда Малахоўскага

Жаданні: спраўджваюцца альбо не спраўджваюцца

«Я — чараўнік, і калі я расплюшчу вочы, то ўбачу свет, які я стварыў, свет, творцам якога з'яўляюся я і толькі я. Затым марудна, нібы заслона на сцэне, прыўздымаюцца павекі. І глядзіце, без сумніву, вось ён, мой свет, дакладна такі, якім я пабудаваў яго».

Р. Бах «Мост праз вечнасць»

І ўсё ж ёсць у гэтым сусвеце нейкія правілы і законы. Напрыклад, дарожны рух на вуліцах зладжаны гарманічна — і без правілаў на дарозе ніяк! Ёсць пэўныя заканамернасці і ў тым, як наша жыццё складаецца. Бывае, што жаданні здзяйсняюцца. А часам — упарта не здзяйсняюцца!..

Без фанатызму

Кажуць, каб жаданне матэрыяльнай кветкай узбуйнела, вось што трэба: расслабленасць, спакой і лёгкае стаўленне. Вялікая важнасць, апантанасць, навязлівыя думкі толькі ствараюць напружанне. Наганяюць варожую энергію, якая толькі аддаляе жаданае. Эзатэрыкі прапануюць нам такую тэорыю: моцна перажываючы, з крыкамі і патрабаваннем, мы толькі смеццем забруджваем сваю душу. «Не стварай сабе куміра», — запавет у хрысціянстве. Не будзь апантаны жаданнем!



Каб жаданні спраўджваліся, трэба ўмець іх лёгка адпускаць, забываць і не баяцца, што не здарыцца. Гэта не значыць, што трэба стаяць на месцы, калі да мэты трэба ісці. Але ж... паўтаруся, што на здзяйсненне жадання трэба ўмець забывацца!

Алена марыла паступіць вучыцца бясплатна на модную спецыяльнасць «псіхалогія». І рыхтавалася — аддана, сур'ёзна. Але ж пры гэтым была ўнутры спакойная: «Як лёс складзецца, так і будзе!» Прымала ўдзел у рэспубліканскай алімпіядзе, але пры

гэтым была сціплай, ні на што не спадзявалася. І... атрымала дыплом першай ступені! Стала студэнткай ужо ўвесну! Так лёс узнагародзіў Алену за спакой і сціпласць.

Песімізм — гэта ненатуральна

Чаму жаданні не спраўджваюцца? Усяму свой час! Бывае, што проста трэба ўмець чакаць. У шчырым спакоі, без страху. Жадаць, але ж з такой устаноўкай, як ва ўжо знаёмай вам Алены: «Як лёс складзецца, так і будзе!»

Песімізм і адсутнасць веры — важкі пляцак за спінай, што толькі абцяжарвае, ну, а карысці — ніякай. Увогуле, негатыўныя думкі — звычка, якая часам неўсвядомлена выпрацоўваецца, часам нават з любоўю шліфуецца шмат гадоў. У чалавека з гэтай звычкай шанцы на спраўджванне жаданага памяншаюцца. І што рабіць? Бяром сілу волі, намер і — не паддаемся дурной звычцы!

Саша збіралася паступаць у Акадэмію мастацтваў — на дызайн. Але ж у мастацкай школе не вучылася, малявала з рэпетытарам. А потым яшчэ і на курсы пайшла. Ёй здавалася, што ўсе больш таленавітыя. Саша ўпадала ў адчай, часта думала пра тое, што яна — зусім няздольная. Яшчэ і ў дзённіку любіла свой боль занатоўваць. Але хіба вызваленнем тое было? Найхутчэй узрошчваннем з любоўю негатыўнага вобраза сябе. У Акадэмію, пабаяўшыся паразы і яшчэ большага адчаю, дзяўчына нават не паспрабавала паступаць. Яе жаданне не спраўдзілася: надта шмат негатыўных думак было ў Сашы. Песімізм, зацыкленасць на «я — дрэнны!» — бруд і ненатуральнасць.

Хто дзесяць разоў на дзень адціскаецца, той ва ўніверсітэт паступіць!



Сістэма «Сімарон» для спраўджвання жаданняў прапануе выдумляць рытуалы. І верыць у іх. Але ж здзяйсняць гэтыя самыя рытуалы без вялікай сур'ёзнасці лёгка і весела.

Якія рытуалы? Ды якія заўгодна! Напрыклад, адціскацца дзесяць разоў штодзень, каб ва ўніверсітэт паступіць. Проста ў гэткай форме мы паведамляем Сусвету пра жаданае, запускаем намер.

Свечку ў царкве паставіць, памаліцца — таксама неблагі рытуал. Знаёмая журналістка падзялілася неяк сваёй цудоўнай гісторыяй: «Прыйшоў момант, калі мне надакучылі непрацяглыя адно-



сіны з хлопцамі, якія хутка вычэрпвалі сябе. Пачувалася тканінай, што марнуецца на драбязу, і сукенку з яе ўжо не пашыць... Захацелася таго адзінага, менавіта “майго” спадарожніка па жыцці. Я пайшла ў царкву, паставіла свечку, папрасіла. Праз два тыдні на працы сустрэла свайго будучага мужа! Ён аказаўся тым адзіным, “маім”».

Можна яшчэ і ў такое прыгожае мерапрыемства згуляць: запісваем жаданні на паперку, кладзём у бутэлечку ды ў рэчку альбо возера закідваем. Некаторыя навукоўцы сцвярджаюць, што вада прачытвае нашыя эмоцыі і нават друкаванае слова. (Глядзіце навукова-папулярны фільм «Вялікая таямніца вады»)

Яшчэ можна ўяўляць, што жаданае ўжо ёсць у вас. Але ж не забывацца на смеласць «адпусціць» і забыць свой намер.

«Хітрыя» і прыхаваныя жаданні таксама часам спраўджваюцца!

У рамане «Зялёны шацёр» рускай пісьменніцы Людмілы Уліцкай ёсць персанаж Саня. Хлопчык наведвае музычную школу. Але хадзіць на канцэрты дарослых музыкаў яму пакутліва. «Не буду ніколі так выдатна граць!» — думае Саня. Потым школьныя ворагі паб’юць хлопца. З пашкоджанай рукой граць на музычным інструменце стала амаль немагчыма. Мама і бабуля сумуюць, а хлопчык пагадзіўся з палёгкаю. Цалкам верагодна, што Саня сам замовіў сітуацыю, каб вырашыць пакутлівую праблему непаўнавартаснасці ў музыцы.

«Хітрыя» і прыхаваныя жаданні таксама часам спраўджваюцца. І нават у людскіх хваробах бываюць свае матывы.

Жыццё як самастойнае даследаванне

Усе гэтыя заканамернасці ў школах і ўніверсітэтах не вывучаюцца. Яны зусім не навуковыя веды, а сумніўная для некаторых эзатэрыка. Ну, і што? Ніхто не замінае нам самім даследаць жыццё. Эксперыментаваць! Ніхто не замінае быць творцам, выдумляць гульні і гуляць у іх — з радасцю, з творчай смеласцю.

Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ

Таямніцы кунг-фу



Кітайскае баявое мастацтва кунг-фу! Многія людзі вялі спрэчку пра тое, што ж яно з сябе ўяўляе. Адны лічылі, што кунг-фу — гэта барацьба з ворагамі. Другія, што гэта мастацтва, якое захоўвае ў сабе шмат чаго таямнічага. Многія мяркуюць, што яно — магія. Аднак калі і ёсць тут нейкая магія, то толькі адна — Сапраўднай, Шчырай Любові.

А яшчэ кунг-фу—гэта веданне жыцця. Кожнага нашага дня. Кожнага позірка. І, па-мойму, зусім не барацьба. А калі і барацьба, то толькі з самім сабой і сваімі жахамі. І зусім не з ворагамі! А ці трэба ўвогуле ваяваць? Трэба проста ўмець таленавіта вырашаць канфліктныя сітуацыі.

Расказвае майстар Кунг-фу П Бо.

— Кунг-фу азначае «моцны, удасканалены чалавек». Мой настаўнік казаў, што кунг-фу — гэта штодзённае выкананне адной і той жа працы. Толькі так можна дасягнуць майстэрства. Іншымі словамі, кунг-фу — гэта кропля, якая здольная разбурыць камень.

— У кунг-фу ёсць такая рэч, як кола ам-Зыонг, альбо інь-янь. Распавядзіце пра гэта.

— Кола ам-Зыонг уяўляе сабой графічную выяву адносін дзвюх процілеглых пачаткаў: мужчынскага (Зыонг) і жаночага (ам). Яна сімвалізуе адзінства. Выгнутая лінія, якая дзеліць яе на дзве роўныя часткі, паказвае на наяўнасць у адзінстве двух супрацьлегласцей — ам і Зыонг. Пасіўны жаночы пачатак пазначаецца чорным колерам, актыўны мужчынскі — белым або чырвоным. Умоўна сістэму ам-Зыонг можна параўнаць з чорна-белым тэлевізарам. У бачанні свету ў чорна-белым малюнку ёсць свая перавага — прастата разумення і аперавання інфармацыяй у рамках гэтай сістэмы. Калі мы кажам «дабро і зло», «мужчына і жанчына», «цяпло і холад», мы паказваем на адносіны ам-Зыонг. У кунг-фу гэтыя адносіны выкарыстоўваюцца вельмі часта. Змена элементаў ам і Зыонг з'яўляецца неабходнай умовай жыцця, руху, развіцця, бою. У крузе ам-Зыонг можна ўбачыць прынцыпы існавання і ўзаемадзеяння

матэрыі і духу, прасторы і часу, руху і сілы, жыцця і смерці. У кунг-фу ўсе элементы воінскага мастацтва падзелены па прыкметах ам-Зыонг, таму вывучэнне аднаго элемента цягне за сабой пазнанне яго антыподу. Нараджаецца сістэмнасць, цэласнасць, выключаецца патрапленне ў сістэму выпадковых элементаў. А як вышэйшай кропкай майстэрства з'яўляецца гармонія, раўнавага супрацьлегласцей, то першым крокам да яго можа быць толькі развіццё гэтых супрацьлегласцей. Прынц Гаутама жыў у палацы і быў ізаляваны ад вонкавага свету, а потым ператварыўся ў пустэльніка, спазнаў усе пакуты ў гэтым жыцці — і толькі пасля гэтага ён стаў прасветленым, стаў Будай. Тады ён выклаў канцэпцыю сярэдняга шляху — шчасце ў «шэрасці» (паміж чорным і белым).

— Ці раўназначныя па сутнасці сваёй элементы ам і Зыонг?

— Што першаснае: дух ці матэрыя? Адказ адназначны — дух і матэрыя адначасова і раўназначна прысутнічаюць у Сусвеце. Формы і колькасці рэчыва з'яўляюцца матэрыяльнай меркай свету.

— Можна называць кунг-фу спортам?

— «Хутчэй, вышэй, мацней» — такі дэвіз першых алімпійскіх гульняў. Гэтыя вядомыя ва ўсім свеце словы вельмі ярка характарызуюць задачу спорту — удасканаленне дзеля таго, каб стаць лепшым за іншых. Гэта добра ці дрэнна? З пункту гледжання кітайскай філасофіі, ні добра, ні дрэнна. Але дрэнна тут усё ж такі тое, што спартсмен на шляху развіцця арыентуецца на свае моцныя бакі і на слабыя бакі суперніка. Вянком заняткаў спортам з'яўляецца перамога. У кунг-фу кажуць, што перамагчы можна ўсіх, але амаль немагчыма перамагчы сябе. У сапраўдных школах ніколі не б'юцца дзеля перамогі. Баі праводзяцца, каб дамагчыся пэўных псіха-фізічных станаў. Кунг-фу нельга лічыць спортам, бо гэта праца, якая не мае канца, — праца на ўсё жыццё. Гэта пэўны лад жыцця, у якім усё як бы вывернута навыварат — тое, што звычайны чалавек выстаўляе напаказ, чалавек кунг-фу хавае. Баксёр смяецца з шахматыста. Шахматыст смяецца з баксёра. З іх абодвух смяецца штукар. Майстар кунг-фу ні з каго не смяецца, ён сам — баксёр, шахматыст і штукар. Але ён яшчэ і лекар, і філосаф. Не хачу пакрыўдзіць спартсменаў. Бо і праз спорт можна дасягнуць высокай ступені духоўнасці і жыццёвасці, гледзячы якую задачу ставіць перад сабой.

— Якая ваша канцэпцыя дабра і зла?

— Свет недасканалы, таму ён развіваецца. Людзі недасканалыя, таму яны хочуць стаць лепшымі. Дабро і зло заўсёды побач. Настаўнікі кунг-фу не вучаць дабру ці злу, не вучаць адрозніваць адно ад іншага. Яны вучаць Дао, гэта значыць Шляху. Калі чалавек варты Дао, то незалежна ад сваёй натуры ён будзе рабіцца лепшым. Але злому прыйдзецца даўжэй ісці. Калі ж добры ці злы не будуць варты Дао, то яны будуць станавіцца ўсё горш і горш. Гісторыя ведае нямала выпадкаў, калі разбойнік станавіўся святым, а прыстойны чалавек у пэўных умовах — нягоднікам. Часта бывае, што нехта здаецца добрым і сціплым ад недахопу ўнутранай энергіі, а злым — ад лішку сіл і недахопу выхавання.

Кацярына БЯДУЛІНА

● Слоўнік-алоўнік

Екат*а*ць



Екат*а*ць — 1. Голасна, працягла крычаць ад моцнага болю 2. Скавытаць (пра жывёлаў), што значыць «жаласна папіскваць, ціха ныць» 3. Пераноснае значэнне — «крыўдзіцца, скардзіцца» (размоўнае, зневажальнае).

*Пакуль яна **екатала** і тузалася, спрабуючы вырвацца, ён хутка абкруціў яе кісці вяроўкай, зацяў вузел.*

Васіль Быкаў

*Далёка-далёка **екаталі** сабакі.*

Леанід Дайнека

*Ад вашых сякер дрэвы скачуць дагары і **якоча** звер!*

Аркадзь Куляшоў.

Сінонімы: павіскваць, выць, жаліцца, скугатаць, плакаць, вішчаць, пішчаць.

Згуляем у гульню «маршрут», паўтарыўшы папярэднія вывучаныя слоўкі і дадаўшы свежанькае **екат*а*ць.**

Адхл*а*нне — кароткая палёгка ад цяжкой, працяглай працы.

Баг*о*ўка — божая кароўка.

Ванц*а*к — рэзкі, востры боль у жываце. А таксама зварот кішак, конская хвароба.

Пайсці на глум — псавацца.

Бяром родны маршрут «дом-школа» і ў розных кропках, па парадку размяшчаем вывучаныя словы. Напрыклад, першая кропка — лава ля пад'езда. Уяўляем там **адхл*а*нне —** агарод і людзей, што адпачываюць ад цяжкой працы. І на асфальце пішам крэйдай, вялікімі літарамі: «**Адхл*а*нне**» і г.д.

Лепш адкладваецца ў памяці нешта ўражвальнае, вялікае па колькасці. Напрыклад, не адна багоўка, а фантастычна вялікая колькасць баговак.

Пракручваем у галаве «мульцік» з маршрутам некалькі разоў. Каб не забыцца...

Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ,
малюнак Вольгі АЛЕЙНІКАВАЙ, 8 клас, гімназія № 25, г. Мінск

Не ўмеем чытаць...

Што сёння цікавіць сучасных падлеткаў у першую чаргу? Інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, розныя гульнявыя прыстаўкі. А вось кнігі, зыходзячы з разнастайных псіхалагічных апытанняў, захапляюць малы працэнт моладзі. З чым гэта звязана? З пастаянным змяненнем школьнай вучэбнай праграмы альбо гэта натуральная рэакцыя маладога пакалення на з'яўленне сучасных гаджэтаў ды інфарматызацыю грамадства? У гэтым я спрабавала разабрацца разам з Людмілай Аляксандраўнай Фраловай — выкладчыцай рускай мовы і літаратуры адной са сталічных гімназій.

«Кніга» і «адпачыць» — словы з розных моваў?

— Яшчэ дваццаць-трыццаць гадоў таму кніга была галоўнай прыемнасцю і самым лепшым спосабам адпачыць, — распачынае Людміла Аляксандраўна. — Кіно і тэлебачанне былі не такімі масавымі і даступнымі, і правесці час з добрай кнігай у руках было сапраўдным задавальненнем. Зараз прыйшоў пасля працы або заняткаў дадому — значна прасцей націснуць кнопку на пульце і назіраць за падзеямі ў чарговым модным серыяле, чым унікаць у сюжэт добрага рамана і прымушаць галаву працаваць. Вядома, гэта не значыць, што людзі зусім перасталі чытаць. Кожны дарослы ўсё яшчэ па старой звычцы працягвае цікавіцца добрымі кнігамі, але ж не так часта, як раней. А вось што тычыцца маладых людзей, то для многіх з іх паняцці «кніга» і «адпачыць» — словы з розных моваў. І нельга сказаць, што гэта віна бацькоў або саміх дзяцей. З ранніх гадоў маладыя людзі прызвычаіліся да тэлевізара, выдатна ўмеюць карыстацца камп'ютарамі і Інтэрнэтам, а мабільныя тэлефоны — абавязковы атрыбут кожнага. Адзінымі месцамі, дзе хлопцаў і дзяўчат знаёмяць з класікай літаратуры і імкнуцца прышчапіць любоў да чытання, застаюцца школы, каледжы і ВНУ.

— Але мне здаецца, што школьная праграма складзеная не найлепшым чынам. У нашай адукацыі багата хібаў!

— Так. У праграме па рускай літаратуры не ўлічаны той факт, што многія навучэнцы (асабліва ў сельскіх школах) прыходзяць з пачатковай школы ў сярэднюю з недастаткова развітым навыкам чытання, які можа быць кампенсаваны толькі ўрокамі літаратуры. Несфармаваны навык чытання вядзе да павольнага засваення вучэбнага матэрыялу і па іншых прадметах. Многія творы, якія лічацца лепшымі, выключаюцца з навучальных праграм. Рэзка паменшаная колькасць гадзін (у 1,5—2 разы) на выкладанне літаратуры ў

7—11-х класах. Пры тым, што ў 9—10 класах вывучаецца руская літаратура XIX стагоддзя — самы складаны, аб' ёмны і маральна «нагружаны» курс (творчасць Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага, А. Чэхава). Настаўнікі-славеснікі наўрад ці змогуць вывучыць са школьнікамі гэты курс так, каб навучэнцы засвоілі хаця б нейкі адукацыйны мінімум. Памяншэнне ўвагі да рускай літаратуры XIX стагоддзя, прызнанай ва ўсім свеце адной з самых маральна багатых, прывядзе да яшчэ больш рэзкага падзення цікавасці да класічнай літаратуры. А яшчэ некаторыя творы школьнай праграмы падабраныя няўдачна і наогул могуць адбіць усякую ахвоту чытаць. Іншыя творы рускай літаратуры вывучаюцца занадта рана і замест таго, каб стаць улюбёнымі, застаюцца незразумелымі навучэнцамі. Духоўнае ўдасканаленне можа адбывацца толькі на добрых уроках літаратуры. Беларускі класік Іван Шамякін невыпадкова, думаю, увесь час паўтараў: «Сёння трэба думаць пра душу». Калі чалавек перастае чытаць, ён перастае думаць. Не варта забываць: інтэлектуаламі не нараджаюцца, інтэлектуаламі становяцца. Развіць у сабе любоў да кніг — гэта адкрыць новы свет. Не варта забываць, што як бы далёка не крочыў прагрэс, кніга застанецца адным з нашых галоўных скарбаў.

Як папулярызаваць літаратуру сярод падлеткаў?

Загадчыца бібліятэкі гімназіі № 192 Людміла Бурая: «Зацікавіць моладзь кнігамі не так складана. Проста трэба ведаць кожнае дзіця, яго густы і захапленні. А хто як не бацькі ведаюць гэта? Таму бацькам трэба імкнуцца падбіраць дзецям кнігі, якія, на іх думку, будуць цікавымі. Акрамя таго, неабходна ісці ў нагу з часам. Электронныя кнігі? Чаму б і не! Бо значна лепш замест гульнявой прыстаўкі падарыць гэты гаджэт. Дарэчы, многія сучасныя пісьменнікі выкладаюць свае працы спачатку ў Інтэрнэт, а толькі потым адносяць іх у выдавецтва. І ўсё гэта натуральна. Бо мы жывём у XXI стагоддзі. І калі ваша дзіця шмат сядзіць у Інтэрнэце, падкажыце яму пару цікавых літаратурных сайтаў. Галоўнае пачаць і зацікавіць, а далей мала хто ўтрымаецца ад таго, каб правесці свой вольны час за чытаннем».

Галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп: «Нашы пісьменнікі не павінны пагарджаць адкрытымі семінарамі і сустрэчамі са школьнікамі, на якіх яны змаглі б абмяркоўваць розныя кнігі, даведвацца адзін ад аднаго нешта новае, дзяліцца ўражаннямі аб ужо прачытаным, даваць парады. Так можна было б зацікавіць нашу моладзь. А акрамя таго, у якім бы жанры не працаваў пісьменнік, трэба не забываць пра апавяданні для юных чытачоў, пра казкі».

Паліна БУЧЭЛЬ, 17 гадоў, Мінск

● Дынамік

Дыялектыка душы Сымона-музыкі

«Dialectic Soul» — «Сымон-музыка», Рэчыца, 2011, «Strong Music Productions»



Нягледзячы на пэўныя аргпраблемы з канцэртамі беларускіх рок-гуртоў, колькасць музычных альбомаў стала павялічваецца. Не адстае і якасць. На сусветнай рок-прасторы такі стан часам засмучаў спажыўцоў, бо стылі рок-музыкі множыліся, а альбомы ўсё нагадвалі адзін аднаго стандартным чаргаваннем трэкаў па тыпу хутка-марудна. А потым Эндру Лойд Ўэбэр з Цімам Райсам асмеліліся на рок-оперу «Ісус Хрыстос — суперзорка» — і нешта змянілася. У нас жа прыемная колькасць не ставарае аднастайнасць, фантазія музыкаў актывізуецца.

Яшчэ ў трэцім выпуску CD-серыі «Hard Life — Heavy Music» (2004) малады на той час рэчыцкі дэз-метал-гурт «Dialectic Soul» вырашыў замахнуцца на класіку, зрабіўшы сапраўдны хіт паводле знакамітай паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Гэта была адна, хоць і даволі працяглая, песня (05’37), але метал-фэны адназначна выказваліся за працяг такіх эксперыментаў. На прэзентацыйным канцэрце ў сталічным клубе «Reactor» музыкі паабяцалі працяг, але верылася з цяжкасцю. І вось летась да сталіцы даляцелі весткі, што лэйбл «Strong Music Productions», на якім дэбютавалі такія знакамітасці, як «Камаедзіца», «Serdce», той жа «Dialectic Soul», ужо здзейсніў такі рэліз. Тактыка бартэру дапамагла трапіць выданню і ў Мінск, адкуль пераможнае шэсце яўнай творчай удачы працягваецца на кожным экстрым-канцэрце.

Адразу варта адзначыць дзівацтва музыкаў, якія на самім альбоме нідзе не напісалі «Dialectic Soul», хоць пачынаецца ён з таго самага мега-хіта «Сымон-музыка» 2004 года. Дый фота ў буклеце, рээстр удзельнікаў падказваюць, што гэта якраз тыя, каго чакалі. Навошта такая таямнічасць? Тлумачыць гітарыст і клавішнік гурта Вячаслаў Знахарэнка: «“Сымон-музыка” — гэта назва праекта музыкаў гурта «Dialectic Soul», якія самі не хочуць, каб у слухачоў былі асацыяцыі з прывычным іміджам. Другі дыск адпаведна будзе мець назву “Сымон-музыка. Частка 2”, але ў планах — прывабіць музыкаў з іншых калектываў, ужо вядуцца перамовы».



Гурт Dialectic Soul

Ці слушная такая тактыка аўтараў праекта, паказвае жывая практыка: у музычных крамах ніводзін прыхільнік экстрыму і не падазрае, што за надта традыцыйнай аздобай акварэлі Васіля Лукіна схаваная шыкоўная melodic-death-metal-опера. Шчыра кажучы, стэрэатыпы мыслення нярэдка збіваюць і дасведчаных людзей з панталыку, бо за стандартным тэрмінам «death-metal» чакаеш толькі хрыпаў і стогнаў, а пра «melodic» нават забываеш. А вось тут і я, крыху расчараваны схемамі сучаснага экстрыму, адчуў эмацыйны катарсіс не толькі ў той яўна выйгрышнай стартавай мелодыі, але і ў пошуку ключавых тэмаў, у шматграннасці самой канструкцыі гэтага маштабнага музычнага палатна (40 хвілін). Дый тут не толькі ўдалыя хіты, але й прынамсі дзве вялікія мелодыі, у развіцці якіх прасочваюцца ўплывы джазу, фольку побач з традыцыйнымі хадамі death-metal: «Сымон-Музыка» і «Родны край». Тут вы на першых дваццаці секундах адчуваеце жывую цеплыню настрою, якая плаўна, нават з украпленнямі духавых, навёрствае гітарным драйвам нястрыманую энергетыку:

Раз Сымону давялося чуць, як граюць дудары,
І яму тады здалося, што да гэтае пары
Ён дзіцятка быў дурное, што не жыў ён, а блукаў,
Што цяпер пазнаў ён тое, чаго шчыра так шукаў.

Час запомніць навечна імёны таленавітых рэалізатараў: Вячаслаў Знахарэнка (гітара, клавішныя), Галіна Куліцкая (клавішныя), Аляксандр Ключнікаў (вакал, гітара, бас, бубны) + яшчэ дзве вакалісткі — Ілона Аўрамчыкава і Вікторыя Бідава. Карацей, «Dialectic Soul».

Далей — «Разважанне аб смерці» (4 хв.) — ну гэта эталонны death-metal паводле эталоннага Якуба Коласа:

Смерць, жыццё — дзіўна ўсё гэта! І нашто жыць, каб сканаць,
Смерць прыйшла — і песня спета, і прыкладзена пячаць.
І няўжо не будзе следу, жыў на свеце ты ці не?..
Смуткаваў Сымон па дзеду, а з ім бачыўся ў сне.

Не менш узорны death і ў згаданай «Родны край» паводле вядомага кожнаму школьніку ўрыўку пад словы «з двух бакоў браткі з дубінай заганялі нас у рай» (о вялікі Колас! Як тонка здолеў выказаць векавую пакуту, каб знайшла яна водгалас і ў экстрэмалаў сучаснасці). Цяпер гэта сапраўдны метал-хіт, дзе словы класіка даходзяць да глыбіняў душ метал-фанаў. А які чароўны фолькавы chorus жаночымі галасамі ўрываецца гарманічна ў структуру melodic-death-акордаў (так і хочацца ўсю паэму зацытаваць, але з музыкай яна яшчэ мацней).

«Крыж няволі» пачынаецца з падманлівай надзеі ў песні жалейкі, каб выбухнуць энергіяй смяротнага (death) пратэсту: «Вы, крыўдзіцелі-зладзеі, вы разбілі мне надзеі... і вам будзе час змяркання, што нясе вам біч выгнання».

А як магутна прагучала б «Вясна» з віртуознымі гітарнымі пасажамі ў кантэксце традыцыйных нашых гуканняў вясны! Бліскучае спалучэнне гроўлінгу і чыстых дзявочых вакалаў, традыцыйнага і авангарднага, але зразумелае і захапляльнае.

Пераканаўча разгортваецца дыялог Сымонкі з дзедам у частцы «Жыццё», якая магла б стаць асобным метал-хітом усялякіх плебісцытаў і CD-складанак. А гэта ж трывалы філасофскі досвед народу нашага, сфармуляваны вялікім паэтам. Важкім сюжэтаўтваральным фрагментам рок-оперы стала і «Развітанне», тэкст якога чамусьці не трапіў у буклет, але слухацкаму асэнсаванню гэта не замінае дзякуючы пільнасці адмыслоўцаў гуказапісу. На фінал — канцэптуальная «Песня вольная» ды энергетычны хіт «Пушча».

Шукаючы аналогій для адэкватнага параўнання ўнікальнага даробку «Dialectic Soul» у праекце «Сымон-музыка», мімаволі прыгадваю яшчэ адзін непаўторны калектыў з той жа Гомельшчыны — «Relikt», які таксама здолеў вярнуць беларускі экстрым да маштабных канцэптуальных альбомаў («Рэкі прабілі лёд»), які нават еўрапейскія спецыялісты называюць узорным паводле якасці запісу. І ўсё ж жанр рок-оперы — нават death-metal-оперы — яшчэ больш складаны. Таму пакуль здзейснены толькі першы этап аўдыёўвасаблення, які натхняе на чаканне адпаведнай тэатральнай пастаноўкі.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА,
музычны крытык

